**18.** Вызначце, колькі назоўнікаў назоўнага склону ўжыта ў скорагаворцы Васіля Жуковіча: *З горкі-горачкі, дзе грэчка, ручаёк прыбег да рэчкі.*
**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**19.** Закончыце народную прыказку: *З вялікага грому …*
**А)** лівень. **Б)** вялікі страх. **В)** вялікі дождж.
**Г)** малы дождж. **Д)** яркая маланка.

**20.** У перакладзе з англійскай мовы слова ***фальклор*** азначае …
**А)** народныя песні. **Б)** творчасць. **В)** народная мудрасць.
**Г)** мастацтва. **Д)** скарб.

**21.** Які адпаведнік ёсць у беларускай мове фразеалагічнаму выразу *ни к селу ни к городу*?
**А)** з вачэй згубіць. **Б)** за вадою пайсці.
**В)** халяўкі смаліць. **Г)** ні да вока ні да бока.
**Д)** ні слыху ні дыху.

**22.** Якія граматычныя формы мае назоўнік? Выберыце правільныя варыянты: *1) час; 2) лік; 3) склон; 4) род.*
**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 1. **В)** 1, 3, 4.
**Г)** 2, 3, 4. **Д)** 2, 4.

**23.** Даўней у народзе *вялікую дарожную карэту* называлі …
**А)** шацёр. **Б)** рупар. **В)** разлог. **Г)** рыдван. **Д)** рыпс.

**24.** Колькі літар у беларускай мове не маюць адпаведных гукаў?
**А)** няма такіх літар. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by
http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ . Тыраж экз. г. Мінск. 2011 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2010»

*Чацвер, 18 лютага 2010 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Пра якую кветку гаворыцца ў вершаванай загадцы М. Пазнякова:

*Гарачае лета, спеюць суніцы,*
*а ён – у пуховай хусцінцы.*

**А)** званочак. **Б)** цюльпан. **В)** дзьмухавец.
**Г)** ландыш. **Д)** нарцыс.

**2.** Якая часціна мовы абазначае прымету прадмета?
**А)** назоўнік. **Б)** прыметнік. **В)** дзеяслоў.
**Г)** займеннік. **Д)** лічэбнік.

**3.** Выберыце правільна напісанае слова.
**А)** дверы. **Б)** дзіверы. **В)** дзьверы. **Г)** дзверы. **Д)** дзвер.

**4.** Дадзены назоўнікі: *1) мастак; 2) машына; 3) дрэва; 4) сябар; 5) кветка.* Якія словы адказваюць на пытанне ***хто***?
**А)** 1, 2. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 5. **Д)** 4.

**5.** Якая літара прапушчана ў словах вершаваных радкоў З. Марозава:

*Абмыўся луг начнымі р..самі,*
*Нектарам пахне траваст..й,*
*На канюшыне пч..лы з в..самі*
*Вядуць разм..вы між сабой.*

**А)** а. **Б)** у. **В)** о. **Г)** э. **Д)** ы.

**6.** Пераблыталіся назвы дзён тыдня:

*1) субота; 2) аўторак; 3) чацвер; 4) нядзеля;*
*5) панядзелак; 6) серада; 7) пятніца.*

Вызначце правільны парадак назваў.

**А)** 4, 1, 5, 2, 6, 3, 7. **Б)** 5, 6, 2, 3, 7, 4, 1. **В)** 1, 7, 3, 6, 2, 5, 4.
**Г)** 2, 6, 5, 3, 1, 4, 7. **Д)** 5, 2, 6, 3, 7, 1, 4.

**7.** Выберыце з прапанаваных слоў толькі назвы гарадскога транспарту для наземнай перавозкі пасажыраў:

*1) камбайн; 2) трамвай; 3) трактар;*
*4) аўтобус; 5) самалёт.*

**А)** 1, 3. **Б)** 2, 4. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**8.** Якога лічэбніка не хапае ў выразе: … *цудаў свету*?

**А)** пяць. **Б)** шэсць. **В)** сем. **Г)** восем. **Д)** дзевяць.

**9.** У некаторых народных казках выкарыстоўваецца выраз: *Вам казка, а мне абаранкаў вязка.* Гэты выраз з'яўляецца ў казцы … .

**А)** зачынам. **Б)** самым напружаным момантам.
**В)** паўторам дзеяння. **Г)** канцоўкай.
**Д)** характарыстыкай герояў.

**10.** У якіх словах з прыведзеных замест кропак патрэбна ўставіць літару ***я***:

*1) с..стра; 2) з..мля; 3) сц..на;*
*4) с..кунда; 5) цец..рук; 6) зав..зь.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 4.
**В)** 1, 3, 4, 5. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 4, 6.

**11.** Сымонка расказаў сябрам, што дапамагаў дзядулю чысціць трубу для адводу дыму з печы. Як называецца такая труба?

**А)** к**о**мін. **Б)** пр**ы**мус. **В)** кам**і**н. **Г)** з**а**сланка. **Д)** пр**ы**пек.

**12.** Колькі розных назоўнікаў у форме назоўнага склону адзіночнага ліку, якія маюць у сваім складзе тры літары, можна прачытаць у квадраце па гарызанталі і вертыкалі?

| | | |
|---|---|---|
| а | н | я |
| с | о | н |
| а | с | а |

**А)** 3. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**13.** Падлічыце, колькі разоў паўтараецца [***к***] у скорагаворцы:

*Патапка пакаваў пакупнікам пакупкі ў пакункі.*

**А)** 2. **Б)** 4. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**14.** Выберыце з прыведзеных слоў назвы птушак:

*1) крумкач; 2) жаўна; 3) сітаўка; 4) кнігаўка;*
*5) амялушка; 6) пугач.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма назваў птушак. **В)** 1, 4.
**Г)** 2, 3, 5. **Д)** 4, 6.

**15.** Як перакладаецца на беларускую мову рускае слова ***лукошко***?

**А)** скарб. **Б)** куфэрак. **В)** кошык. **Г)** акенца. **Д)** ваза.

**16.** Разгадайце рэбусы і вызначце, пад якой лічбай знаходзіцца назва свойскай жывёлы:

1)
аа аа
аа аа
аааа
аа аа
аа аа

2)


3)


**А)** няма варыянтаў. **Б)** усе варыянты. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**17.** Колькі імён дзяўчынак схавалася ў слове ***Паліна***?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.